«Народная Воля» в Facebook www.facebook.com/nv.online.info,
в Vkontakte www.vk.com/nvonlineinfo

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

№ 58 (4618)

3 жніўня 2021 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.



Народная Воля

Дзякуй усім, хто падтрымлівае «Народную Волю» ў гэты надзвычай цяжкі час.
Рэдакцыя.

БЛІЦ

Несколько дней назад появилась информация о возможной аккредитации журналистов, представителей общественности, экспертного и медийного сообщества для участия 9 августа во встрече с Александром Лукашенко, которая будет транслироваться в прямом эфире.
В связи с этим «Народная Воля» обратилась к ряду известных людей с вопросом:

Вы намерены принять участие во встрече с Александром Лукашенко?

Александр ЯРОШУК, председатель Белорусского конгресса независимых профсоюзов:
– Мы как раз решаем в организации, на днях точно определимся. Я лично склоняюсь к тому, что надо идти. На мой взгляд, сейчас надо все делать для того, чтобы выйти на диалог. И для этого нужно использовать любые возможности. Тем более это прямой эфир.

Владимир НЕКЛЯЕВ, экс-кандидат в президенты Республики Беларусь:
– Не готов ответить. Надо подумать.

Гарри ПОГОНЯЙЛО, председатель юридической комиссии Белорусского Хельсинкского комитета:
– Нет. Я с этим человеком не хочу разговаривать…

Олег ТРУСОВ, депутат Верховного Совета 12-го созыва, кандидат исторических наук:
– Нет.

Андрей БАСТУНЕЦ, юрист, председатель Белорусской ассоциации журналистов:
– Думаю, идти надо. А вот какие вопросы задавать – это уже отдельная тема.

Игорь БОРИСОВ, председатель Белорусской социал-демократической партии (Грамада):
– У нас таких планов не было. А вот журналистам (тем, которые здесь остались), я думаю, надо идти. Во-первых, это их работа. Во-вторых, ну а кто как не журналисты будут выстраивать мосты между независимой частью общества (от которой ничего не зависит) и теми, кто удерживает власть? Журналисты в этой ситуации выходят на первый план.

Александр БУХВОСТОВ, председатель Свободного профсоюза металлистов:
– Честно говоря, как-то пропустил эту новость. Но обсудим!

Владимир ГОНЧАРИК, кандидат в президенты Республики Беларусь в 2011 году:
– А кто имеется в виду под представителями общественности?..
Я не планировал, если честно. И не вижу большого смысла в этом разговоре. Хотя я всегда выступал и выступаю за прямой эфир и прямой разговор. Но, мне кажется, мы услышим все то, что уже слышали…
Мне кажется, отбор на это мероприятие будет происходить по принципу лояльности к власти, и будет жесткий отбор. Не думаю, что «Народная Воля» имеет шанс попасть на это мероприятие.

Сергей ЧЕРЕЧЕНЬ, бизнесмен, кандидат в президенты Республики Беларусь в 2020 году:
– Еще есть пару дней на раздумье…
Если идти, то разговор должен быть предельно откровенным, нужно задавать прямые вопросы, не обтекаемые. Но дадут ли возможность? Можно задать вопрос и сразу оказаться в СИЗО, но, думаю, этого мало кому хочется.
Чуть больше недели как закончились масштабные задержания и зачистка гражданского поля и тут сразу после этого – большой разговор… Много вопросов…
А прийти и не задать вопрос – объявят врагом народа.
Если честно, я уже и вопросы сформулировал, которые хотел бы задать. Но еще необходимо пару дней, чтобы понять – стоит идти или нет.

Светлана КАЛИНКИНА, главный редактор сайта «Белорусский партизан»:
– Нет. Во-первых, мы не средство массовой информации. Во-вторых, я уже говорила, что мне Александр Лукашенко интересен как человек после отставки. Я всегда хотела, чтобы он мирно, спокойно ушел на пенсию, оставил власть и вот тогда психологически он был бы мне интересен. То, что человек насильственно удерживает власть, стремится остаться – это не оригинально, это делали многие диктаторы.

Юрий ГУБАРЕВIЧ, глава движения "За Свободу!":
– Я даже ничего не слышал об этом. Сегодня у нас будет заседание Рады. Возможно, обсудим. Но не уверен, что решение будет положительным.

Владимир МАЦКЕВИЧ, философ:
– Не намерен и никогда не имел намерения. Если для журналистов это профессиональная функция, даже в каком-то смысле обязанность, то для людей моего статуса, которые понимают, насколько это срежессированное марионеточное мероприятие, и участие в нем недостойно честного человека. И сейчас, когда произошла зачистка, экспертные организации лишены юридических лиц. Еще до этого наезда на общество можно было бы подавать заявку, а сейчас у тебя обязательно спросят: а вы кто такой, кого представляете, кто за вами стоит? Поэтому только персональное приглашение могло бы побудить меня задуматься на эту тему. А так – нет.

Валентин ГОЛУБЕВ, депутат Верховного Совета Республики Беларусь 12-го созыва, доктор исторических наук:
– Нет. Даже не хочу говорить…

Сергей НЕРОВНЫЙ, бывший главный редактор газеты «Вольный город» (г.Кричев):
– Нет. Мне этот человек не интересен.

Владимир ЛИПСКИЙ, главный редактор журнала «Вясёлка», лауреат Государственной премии:
– Нет. Много нюансов, но о них только при личной встрече…

Оксана КОЛБ, главный редактор электронной газеты «Новы час»:
– Нет. Не вижу смысла…

Александр УЛИТЕНОК, основатель и издатель газеты «Свободные новости плюс»:
– Нет. У меня на этот день запланировано важное семейное мероприятие.

Леонтий ЗДАНЕВИЧ, депутат Верховного Совета Республики Беларусь 12-го созыва:
– Нет. Разговора на равных ведь не будет. И первое слово, и последнее, а также среднее слово – все слова будут за Александром Лукашенко. Предстоит монолог, а не разговор.

Игорь ЛЕЩЕНЯ, экс-посол Беларуси в Словении:
– Попытался себя там представить. Но пока это слабо получается.

Андрей ДМИТРИЕВ, сопредседатель движения «Говори правду», кандидат в президенты Республики Беларусь 2020 года:
– Мне кажется, это все равно будет разговор между своими. И ты абсолютно не свободен в том, чтобы туда попасть и задать вопрос. Но пока мы окончательно не определились, еще есть время подумать.

Опрашивали Марина КОКТЫШ и Елена МОЛОЧКО.

З НАГОДЫ

Старэйшы беларускі чыгуначны вакзал святкуе…



У аграгарадку Парэчча, дзе знаходзіцца самы стары ў Беларусі чыгуначны вакзал, прайшло яркае тэматычнае свята.
Станцыя Парэчча ў Гродзенскім раёне 1 жніўня ператваралася ў вялікую канцэртную пляцоўку. Тут на працягу дня выступалі артысты і калектывы мастацкай творчасці клубных устаноў Гродзенскага раёна. Падчас тэатралізаванага адкрыцця свята госці акунуліся ў атмасферу 1862 года, калі быў адкрыты першы на тэрыторыі Беларусі чыгуначны вакзал.

ШЛАГБАУМ

Учора выезду з Беларусі ў ЕС на граніцы чакалі больш за 1,7 тысячы фур



На мяжы Беларусі з Еўрасаюзам, паводле даных на 8.00 гадзін учарашняга дня, выезду чакалі больш за 1,7 тысячы фур. Гэта вынікала з інфармацыі, размешчанай на сайце Дзяржпагранкамітэта, паведаміла БЕЛТА.
На беларуска-латвійскай мяжы перад пунктам пропуску «Грыгароўшчына» сабралася больш за 90 грузавікоў, «Урбаны» – звыш 150.
Уезду ў Літву перад пунктам пропуску «Відзы» чакаюць больш за 60 вялікагрузаў, «Катлоўка» – 180, «Каменны Лог» – больш за 390, «Беняконі» – звыш 300, «Прывалка» – больш за 290.
На польскім напрамку перад пунктам пропуску «Брузгі» сабралася больш за 160 вялікагрузаў, «Бераставіца» – звыш 70, «Казловічы» – больш за 60.

УРАДЖАЙ-2021

Аграрыі набліжаюцца да чацвёртага мільёна тон намалочанага збожжа



Паводле даных Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, на раніцу 2 жніўня збожжавыя і зернебабовыя культуры (без кукурузы, грэчкі і проса) былі ўбраны з 1044,2 тыс. га, што складала 48,7 працэнта запланаваных плошчаў.
Па намалоце збожжа лідзіравала на ўчарашні дзень Мінская вобласць – 806,4 тыс. тон, на другім месцы – Брэсцкая вобласць, дзе атрымана 781 тыс. тон. У Гродзенскай вобласці было намалочана 499,7 тыс. тон, у Віцебскай – 439 тыс. тон, у Магілёўскай – 434,5 тыс. тон, у Гомельскай – 430,4 тыс. тон.

З-ЗА КРАТАЎ

Якія навіны ў Паўла Севярынца?



Як распавяла "Народнай Волі" яго жонка, на канец жніўня прызначаны разгляд апеляцыйнай скаргі па ягонай справе.
"Іншых навінаў пакуль няма, – гаворыць Вольга. – *Вядома, што на апеляцыю асабліва ніхто не спадзяецца, але тым не менш.*
Сядзіць Павел у Магілёве, лісты ад яго прыходзяць. Ці будуць яго этапаваць да апеляцыйнага суда ў калонію – пакуль дакладна невядома".

Аліна ВЕТРАВА.

НА СВЯЗИ – ТОКИО

На вчерашний день Беларусь имела всего две олимпийские медали

Иван Литвинович завоевал золотую медаль в прыжках на батуте. Парень из Вилейки смог обойти опытного китайца Дун Дуна и Дилана Шмидта из Новой Зеландии.
Олимпийская бронза у **Максима Недосекова**, который отличился в прыжках в высоту. Он преодолел планку в 2 метра 37 сантиметров.

ЧУЛІ?

Авіяцыя МНС Беларусі працягвае ліквідаваць пажар у раёне турэцкага Мармарыса



«Экіпажы Мі-8 пазаўчора выканалі 8 палётаў, налёт склаў 12 гадзін 29 хвілін. За гэты час было 90 зліваў вады. Да месцаў ліквідацыі пажараў дастаўлены 12 турэцкіх ратавальнікаў», – расказалі ў прэс-службе Міністэрства надзвычайных сітуацый.

Беларускія экіпажы працуюць у міжнароднай камандзе сумесна з іншымі верталётамі і самалётамі, якія разам з наземнымі сіламі ажыццяўляюць абарону горада ад наймацнейшага ляснога пажару. Пасля начнога перапынку, падчас якога праводзіцца тэхнічнае абслугоўванне верталётаў наземнымі спецыялістамі авіяцыі МНС Беларусі, верталёты Мі-8 зноў пачынаюць тушэнне.

За мінулы тыдзень экіпажы ўжо выканалі 24 палёты, налёт склаў 38 гадзін 48 хвілін. За гэты час яны выканалі 346 зліваў. Акрамя таго, ажыццёўлена дастаўка 18 турэцкіх ратавальнікаў да месцаў ліквідацыі пажараў.

(belta.by)

ПРАГНОЗ

Цёплае дажджлівае надвор'е чакаецца ў Беларусі на гэтым тыдні

Цёплае дажджлівае надвор'е чакаецца ў Беларусі на гэтым тыдні, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

«Жнівень толькі пачаўся, але ўжо азнаменаваўся выхадам актыўнага паўднёвага цыклону, які прынёс у заходнія вобласці Беларусі інтэнсіўныя дажджы. Сёння на працягу дня цэнтр цыклону будзе ісці праз паўночны захад нашай краіны на Пскоўскую вобласць Расіі, таму на большай частцы тэрыторыі пройдуць дажджы, месцамі з навальніцамі, па паўночным захадзе ў асобных раёнах чакаюцца моцныя дажджы. У многіх раёнах рэспублікі прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15-20 м/с», – расказалі ў Белгідрамецэ карэспандэнту БЕЛТА.

У бліжэйшыя суткі франтальныя раздзелы пакінуць тэрыторыю Беларусі і ўмовы надвор'я будзе вызначаць халаднаватая няўстойлівая паветраная маса.

У аўторак, 3 жніўня, месцамі па рэспубліцы чакаюцца кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Вецер прагназуецца заходні парывісты, уначы месцамі ў паўночных раёнах моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 9–15. Удзень будзе ад плюс 20 па поўначы да 26 градусаў цяпла па поўдні краіны.

У сераду, 4 жніўня, уначы будзе пераважна без ападкаў, раніцай і ўдзень месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы. Вецер чакаецца няўстойлівы слабы да ўмеранага, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 8–13. Удзень паветра прагрэецца ад 20 да 27 градусаў.

У чацвер, 5 жніўня, месцамі па рэспубліцы пройдуць кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы. Вецер прагназуецца няўстойлівы слабы да ўмеранага, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 11–17. Удзень будзе 20–27 градусаў цяпла.

У пятніцу, 6 жніўня, праз тэрыторыю Беларусі будзе перамяшчацца чарговая сістэма актыўных атмасферных франтоў. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах прагназуецца моцныя дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 10 па поўначы да 18 градусаў цяпла па паўднёвым усходзе краіны. Удзень будзе плюс 18–25, па паўднёвым усходзе плюс 26–28 градусаў.

Паводле прагнозаў сіноптыкаў, у выхадныя захаваецца няўстойлівае ўмерана цёплае надвор'е.

У цэлым тэмпература ў першую дэкаду жніўня прагназуецца на 1–2 градусы вышэйшай за кліматычную норму.-

SOS!

Литовские пограничники задержали в воскресенье рекордное количество мигрантов

Предыдущий рекорд продержался менее недели.

На белорусско-литовской границе установлен новый рекорд. За сутки были задержаны 289 мигрантов, которые перешли ее в обход пунктов пропуска, сообщает пресс-служба литовской пограничной службы.

Предыдущий рекорд продержался менее недели. В прошлую среду был задержан 171 мигрант.

С начала года на границе задержали 3 832 мигранта, из которых 2555 были гражданами Ирака.


Создается впечатление, что с белорусской стороны граница с Литвой вообще не охраняется. А как же прежние утверждения наших властей насчет того, что «граница у нас на замке»?



ЖИЗНЬ КАК ОНА ЕСТЬ

Для Юлии Чернявской мама приготовила подарок

Свой день рождения **Юлия ЧЕРНЯВСКАЯ**, драматург, публицист, вдова Юрия Зиссера, скорей всего, встретит, находясь по-прежнему под домашним арестом. Вряд ли к 5 августа изменится мера пресечения, выбранная для нее следователем по уголовному делу и связанная якобы с неуплатой налогов сотрудниками ООО «Тут Бай медиа». Тем не менее ее мама, Александра Григорьевна Чернявская, готовится к празднику. Она даже купила дочери подарок.



Мама Юлии Чернявской.

– Я сейчас ничего не откладываю на завтра. Мне 82 года, со мной может случится всё, что угодно. Дождусь ли я Юлию на свободе? Увижусь ли, обниму свою дочь? Я ведь могу каждый день пять раз умереть. Но подарок от меня она получит в любом случае. Это картина белорусского художника Василия Сумарева. Пейзаж.

Я специально ходила к Василию Федоровичу в мастерскую. Мы знакомы с ним с незапамятных времен, Юлия школьницей ходила к нему в студию живописи во Дворец пионеров. Василий Сумарев – трогательный, открытый человек. Его живопись вызывает во мне самые лучшие чувства. Признаюсь, не удержалась и купила себе его картину тоже. Так что, можно сказать, я хорошо подготовилась к празднику.

Вы спрашиваете, как Юлино здоровье? Через адвоката она передала мне, что если будет что-то серьезное, она уверена, что ее отвезут к врачам. «А если случится пожар, то меня обязательно вынесут»,

– вот дословно слова дочери. Чувство юмора ее не оставило. Юле можно выходить на лоджию. А вот со старой матерью встретиться нельзя, и для меня это самое прискорбное...

Елена МОЛОЧКО.

СТАЛО ИЗВЕСТНО...

В БГУИР студенты будут платить больше на 400 рублей, в БГУ – на 1000

ВУЗы подняли стоимость обучения на 9–10 процентов.

В новом учебном году белорусские ВУЗы поднимут плату за обучение, сообщают СМИ. Приказы с новыми тарифами появились на сайтах многих университетов.

– Стоимость обучения на 2021/22 учебный год установлена в размере экономически обоснованных затрат, необходимых для подготовки специалистов. В расчете стоимости платного обучения учтены следующие изменения: с 1 января увеличены размеры базовой ставки с 185 рублей до 195 рублей и базовой величины с 27 рублей до 29 рублей. Также увеличен размер минимальной заработной платы с 375 рублей до 400 рублей, – пояснили в БНТУ причину увеличения оплаты за обучение.

Новый размер оплаты будет введен с 1 сентября 2021 года. Стоимость повысится и для первокурсников. Например, если раньше стоимость обучения для первого курса (в зависимости от факультета и специальности) варьировалась от 3633 до 3875 рублей, то теперь она составит от 3996 до 4263 рублей. В среднем повышение составило 9,9 процента.

Также приказы о повышении стоимости обучения появились в ГГУ им. Ф.Скорины, ВГМУ, БГУ, БГУИР, БГМУ и БГЭУ.

Везде учиться станет дороже в среднем на 9–10 процентов. Например, в БГУИР студенты будут платить больше почти на 400 рублей, на некоторых факультетах БГУ разница с предыдущей оплатой составит 1000 рублей.

Согласно исследованию «Студэнцкай абсерваторыі ЗБС», с 2017 по 2020 год стоимость обучения в разных ВУЗах выросла на 29–42 процента в рублях и на 15–30 процентов в долларах. Эти показатели опережают ежегодную инфляцию в несколько раз.

ПАЛІТКУХНЯ

Сёння будуць судзіць Мікалая Казлова

Судовае пасяджэнне па справе кіраўніка Аб'яднанай грамадзянскай партыі пачнецца ў 10.30 раніцы ў судзе Ленінскага раёна Мінска.

Нагадаем, што палітыка абвінавачваюць у разгалошванні дадзеных папярэдняга расследавання.

Вера ВІР.



НЕГАТИВ

Беларусь наторговала с Россией в минус на 3 миллиарда долларов

Негативное сальдо увеличилось почти втрое.

Данные о внешней торговле товарами публикуются с некоторой задержкой. Первая предварительная информация за 6 месяцев стала доступна на рубеже июля и августа, пишет сайт banki24.by.

В целом дефицит товарной торговли составил 1,151 млрд USD в эквиваленте. Дефицит означает, что импорт превышает экспорт и образуется отрицательное сальдо.

Коэффициент покрытия импорта экспортом за 6 месяцев составил 93,9%. Иными словами, в январе–июне на каждые 100 USD импорта приходилось менее 94 USD экспорта.

Дефицит торговли товарами традиционен для современной Беларуси. Ранее он покрывался профицитом во внешней торговле услугами. В последние годы наблюдается тенденция на вытеснение белорусских товаров на потребительском рынке.

Главным торговым партнером Беларуси на протяжении всех лет независимости остается Россия. В 2021 году она также занимает лидирующие позиции.

Как мы и предсказывали в предыдущих материалах, удельный вес РФ даже вырос по сравнению с 2020 годом. Доля России в товарной торговле выросла с 48% до 48,8%.

Росту значения российского вектора способствовало увеличение импорта из этой страны – на 45,9% против +21,9% по экспорту. Опережающий рост импорта в первую очередь связан с удорожанием нефти, которая ввозится в Беларусь для переработки на НПЗ.

Резкий рост импорта из РФ привел к кратному увеличению негативного сальдо торговли с этой страной. Если за 6 месяцев 2020-го оно составило минус 1,090 млрд USD, то за 6 месяцев 2021-го – минус 3,049 млрд USD. Таким образом, «дыра» в товарной торговле выросла в деньгах почти в 3 раза.



Покрытие импорта экспортом в торговле с Россией значительно ухудшилось к 2020 году. В 2020 году экспортные поставки покрывали импортные на 84,8%, а в 2021-м – только на 70,8%.

Первой производной от торговли с Россией является торговля с Евросоюзом. Дело в том, что нефтепродукты, которые вырабатываются из российской нефти, выступают главным экспортным товаром на рынке ЕС. Это значит, что если в нынешних условиях не будет ввоза нефти из России, то не будет и большого экспорта в страны ЕС.

Позитивное сальдо торговли с ЕС за 6 месяцев составило 1,369 млрд USD. В прошлом году оно было негативным – минус 911 млн USD. Это было связано с удешевлением нефти и нефтепродуктов на мировом рынке, а также с малыми поставками сырья из РФ в первом квартале.

СКАНДАЛ НА АЛІМПІЙСКІХ ГУЛЬНЯХ:



беларускую спартсменку, адхіленную ад выступлення на сваёй дыстанцыі пасля крытыкі чыноўнікаў, хацелі па загаду з Мінска гвалтам адправіць з Токіо на радзіму.



З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Крысціна ЦІМАНОЎСКАЯ:

«Загад прыбраць мяне з Гульняў паступіў з вышэйшага, чым мінспорту, узроўню»

Спартсменка Крысціна Ціманоўская дала вялікае інтэрв'ю журналісту «Трыбуны» Дзмітрыю Руто. Вось што яна сказала.

– На дадзены момант я знаходжуся ў аддзяленні паліцыі ў аэрапорце ў Токіо. Пакуль думаю, што я ў бяспецы. Мне сказалі, што ў сітуацыі разбіраюцца, паліцыя падключылася. Людзі звяртаюцца ў МАК, каб там чыноўнікі таксама мне дапамаглі.

– Раскажыце, як, хто і калі вам сказаў пакінуць Токіо?

– Учора да мяне прыйшоў галоўны трэнер нацыянальнай каманды Юрый Майсіевіч. Ён прапанаваў мне адмовіцца ад удзелу ў бегу на 200 метраў, сказаць, што ў мяне траўма. Зняцца і паляцець дадому. Ён сказаў, што мяне трэба прыбраць з Алімпіяды. На дадзены момант мяне хочуць прыбраць толькі з Алімпіяды, але калі я адмоўлюся і выйду на дыстанцыю ў 200 метраў, то мяне будуць прыбіраць са зборнай, пазбаўляць працы і, магчыма, будуць яшчэ нейкія наступствы.

Мы з трэнерам яшчэ доўга размаўлялі і ўсё ж прыйшлі да рашэння, што я пабягу, але не буду даваць ніякіх каментарыяў. Маўляў, усё пройдзе спакойна. Прабягу 200 метраў і вярнуся дадому.

Але сёння пасля абеду да мяне ў пакой прыйшлі Артур Шумак, прадстаўнік нашай нацкаманды, і Майсіевіч, і яны мне сказалі, што літаральна праз пару гадзін я павінна быць у аэрапорце. Мне трэба хутка збіраць рэчы і выязджаць.

Прыйшоў псіхолаг, які спрабаваў са мной размаўляць. Не памятаю яго прозвішча, таму што я яго старалася не слухаць. Ён мне казаў нейкае трызненне. Кшталту ён працаваў з забойцамі, у «Навінках», шмат чаго пабачыў. Незразумела, навошта мне гэта. Імкнулася яго не слухаць.

Потым ён спрабаваў паставіць сябе на маё месца, а мяне – на яго. Сядаў і рабіў выгляд, што ён – гэта я. І ён іграў ролю, быццам я сяджу ў кабінеце міністра спорту і кажу: «Так, я вінаватая, сама ініцыявала гэтую сустрэчу». Навошта ён гэта рабіў, я наогул не зразумела.

Пасля гэтага ў пакой ізноў зайшоў Шумак і сказаў, што ў мяне 40 хвілін, каб сабрацца. Я пачала складаць рэчы, да мяне кожныя 10 хвілін падыходзілі і правяралі, ці хутка я збяруся. Я збірала рэчы паўтары гадзіны, імкнулася максімальна зацягваць час. Перапісвалася з мужам, са сваякамі, мы думалі, што рабіць, куды звяртацца. Прынялі рашэнне, што прыеду ў аэрапорт, а там пайду ў паліцыю. Так урэшце і зрабіла.

– Ці праўда, што вас суправаджалі людзі спартыўнага целаскладу?

– Не. Са мной былі два чалавекі: псіхолаг і прадстаўнік ад НАК (*начальнік аддзела міжнародных адносін НАК* **Васіль Юрчык. – Tribuna.com**).

– Як вас везлі? У машыну не запіхвалі?

– Гэтыя людзі ўзялі мае валізкі, пайшлі на паркоўку, паклалі рэчы ў машыну. Я таксама села ў машыну і мы паехалі ў аэрапорт.

– Што там зрабілі ў першую чаргу?

– Мы спачатку доўга не маглі знайсці наш тэрмінал. Калі знайшлі, накіраваліся да стойкі рэгістрацыі. Там было шмат людзей з беларускай каманды, дэлегацыі. Я спытала ў людзей, якія мне дапамагаюць, што рабіць. Яны сказалі, што калі побач ёсць паліцыя, то трэба звяртацца да яе, тады можна не паспець сесці на рэйс. Я так зразумела, што тыя, хто суправаджаў мяне, планавалі стаяць са мной да канца, пакуль я не атрымаю квіток і не пайду на пасадку. Я адразу падышла да паліцыі, і далей ужо пачаліся высвятленні.

– Як тыя, хто вас суправаджаў, адрэагавалі на з'яўленне паліцыі?

– Яны пачалі камусьці тэлефанаваць. Потым селі ў пяці метрах ад мяне і не сыходзілі нікуды, з кімсьці размаўлялі па тэлефоне.

– Прадстаўнікі беларускай дыяспары дапамагалі?

– Так, яны зараз прыйшлі, але яны знаходзяцца на вуліцы, а я ў аддзяленні паліцыі ў аэрапорце. Зараз вырашаецца пытанне, як і што рабіць далей.

– Вам наогул сказалі, чаму вы павінны пакінуць Токіо?

– Не. Як мне сказаў Майсіевіч, гэтае пытанне ўжо не на ўзроўні федэрацыі (лёгкай атлетыкі), не на ўзроўні міністэрства спорту, а ўзроўнем вышэй. Што мяне трэба ліквідаваць з Алімпіяды, вярнуць дадому, таму што я перашкаджаю камандзе выступаць. Мяне трэба прыбраць, каб усе супакоіліся і спаборнічалі далей. І гэта нават нягледзячы на тое, што заўтра я павінна была бегчы 200 метраў.

Майсіевіч казаў яшчэ пра эстафеты. Маўляў, калі дзве дзяўчынкі не змаглі прыляцець, чаму тыя, што засталіся, не могуць прыляцець (яны яшчэ не ў Токіо) з-за таго, што я не хачу бегчы. Трэба даць шанец гэтым дзяўчынкам прабегчы. І гэта пры тым, што мае шанцы выступіць на 200 метраў трэнеры забіраюць.

– НАК паведаміў, што зняцце з Алімпіяды звязана з вашым псіхалагічным станам.

– Ніякія лекары да мяне не прыходзілі, ніхто мяне не абследаваў. У мяне добры псіхалагічны стан, нават нягледзячы на тое, што адбылася такая сітуацыя. Я нармальна трымаюся, у мяне няма ніякіх праблем са здароўем, няма траўм, няма пытанняў з псіхікай. Я была гатова бегчы.

– Некалькі дзён таму вы ў Instagram выклалі відэа, дзе выказаліся з нагоды таго, што вас вырашылі заявіць на эстафету. Гэтыя відэа былі выкліканыя эмоцыямі ці вы запісвалі іх свядома?

– Гэта было зроблена збольшага на эмоцыях, але і не буду адмаўляцца ад сваіх слоў. Так, я абураная! Усё ж такі мы прыехалі на Алімпійскія гульні, і заяўляць нас на дыстанцыю, на якой мы ніколі ў жыцці не выступалі, гэта супярэчыць усім правілам. Гэта поўная непавага да спартсменаў, да працы, у якую ўкладалі ўсе гады, рыхтаваліся да сваіх дыстанцый.

А тут адбываецца поўны хаос. У той момант, калі даведалася, што магу бегчы эстафету, паспрабавала звязацца з Шумаковым. Ён мне не адказаў, проста прачытаў паведамленні. Потым сказаў, што ў яго нібыта дрэнна лавіў тэлефон, таму ён не змог мне адказаць. Майсіевіч мне напісаў, што мне ніхто не адказваў, таму што яны хацелі зберагчы мяне ад лішняй інфармацыі,



каб я лішні раз не нервавалася.

Аднак на эмоцыі мяне вывела іх ігнараванне. Не сам факт таго, што мяне заявілі на эстафету, а поўнае ігнараванне ў мой бок. І тое, што рашэнне было прынята за маёй спінай, не параіўшыся ні са мной, ні з трэнерам і потым нават не паведаміўшы нічога. Гэта поўная непавага!

– Чаму выдалілі гэтыя відэа?

– Мне пачалі тэлефанаваць з пагрозамі і казаць, каб я выдаліла відэа, калі хачу далей быць у спорце. Спачатку я доўга адмаўлялася выдаляць, але потым зрабіла гэта, каб мне перасталі тэлефанаваць.

– А хто тэлефанаваў?

– Старшы трэнер па спрынце Яўгенія Валадзько тэлефанавала нават з Мінска, яшчэ нехта. Валадзько казала, што яе выклікалі ў міністэрства.

– Потым вы напісалі пост, дзе расставілі ўсе кропкі над "і". Гэта ваша рашэнне або вам сказалі апублікаваць такі запіс?

– Не, гэта асабіста маё рашэнне, таму што мне пісалі вельмі многія, камэнтарыяў у дырэкт я атрымала больш за тысячу. Я проста фізічна не магла ўсім адказаць, таму вырашыла напісаць пост, каб расставіць усе кропкі над "і" і растлумачыць прычыну сваіх эмоцый.

Таксама паспрабавала растлумачыць, што калі б да мяне прыйшлі і растлумачылі ўсё па-чалавечы, то, магчыма, гатовая была б прабегчы, хай сабе ніколі і не бегала гэтую дыстанцыю. За каманду гатова была пастаяць. Але паколькі ўсё вырашылі за маёй спінай, гэта непрымальна не толькі для мяне, а ў прынцыпе для любога спартсмена.

– Вы казалі, што баіцеся ляцець у Беларусь. Чаму?

– Таму што я баюся, што ў Беларусі мяне, магчыма, могуць пасадзіць у турму. Я не баюся таго, што мяне звольняць або выганяць з нацкаманды. Я турбуюся пра сваю бяспеку. І думаю, што на дадзены момант у Беларусі для мяне небяспечна.

– А за што вас могуць пасадзіць, вы ж закон не парушалі?

– У тым і справа, што нічога не зрабіла, але пры гэтым мяне пазбавілі права ўдзельнічаць у бегу на 200 метраў і захацелі адправіць дадому. Таму я нават не ведаю, што вам адказаць.

– Вы хочаце атрымаць палітычны прытулак у Аўстрыі?

– Пакуль мы думаем, куды звярнуцца. Думаю, бліжэйшую ноч над гэтым давядзецца паразважаць. І ўжо заўтра прымем нейкае рашэнне.

– Хто вам зараз дапамагае, хто на вашым баку і спрабуе ўрэгуляваць сітуацыю?

– Хлопцы з SOS.BY, Беларускі фонд спартыўнай салідарнасці падключылі ўсе свае магчымасці.

– Як на сітуацыю адрэагавалі іншыя члены нацкаманды?

– Думаю, яны проста нічога не ведалі. Калі даведаліся пра эстафету, пра мае сторысы ў Instagram, некаторыя хлопцы мяне падтрымалі. Сказалі, што мяне разумеюць і падтрымліваюць. А з нагоды майго ад'езду ніхто нічога не ведаў, ніякай рэакцыі няма.

– Напэўна, баяцца выказацца.

– Я думаю так.

– Вы ведаеце, што на дзяржаўным тэлебачанні ў Беларусі вас напярэдадні актыўна абмяркоўвалі?

– Так, усё ведаю, мне дасылалі інфармацыю і відэа. Што я магу сказаць? Калі ўбачыла, што пра мяне кажуць па тэлебачанні, што кажа **Азаронак** і іншыя рэпарцёры, то ў мяне прапала да іх усялякая павага як да мужчын, таму што яны дазваляюць у дачыненні да дзяўчыны непрыемныя словы. Я ж нічога такога не зрабіла, нічога не сказала. Палітыку не кранала. Але атрымала шквал негатыву, які мне незразумелы, у тым ліку ў Instagram.

– Што далей будзеце рабіць?

– Зараз я ў паліцыі, а далей буду прасіць прытулак. Крок за крокам будзем дзейнічаць. Я планую пакінуць Токіо, але не тым рэйсам, якім мяне хацелі адправіць. Зараз я пад абаронай паліцыі.

– Як думаеце, да чаго можа прывесці вашая сітуацыя? Бо зварот у МАК ужо паступіў.

– Калі шчыра, пакуль не ведаю, да чаго можа прывесці. Але вінаватыя ў любым выпадку павінны быць пакараныя. Вось так фарміравалі каманду, аблажаліся з эстафетамі. І людзі павінны быць пакараны. Думаю, што гэта, хутчэй за ўсё, віна не фэдэрацыі, а нацкаманды па лёгкай атлетыцы.

ТЫМ ЧАСАМ

Ціманоўская плануе ляцець у Польшчу

Беларуская лёгкаатлетка правяла ноч у гатэлі такійскага аэрапорта. Яна заявіла, што не будзе вяртацца ў Беларусь.

Міжнародны алімпійскі камітэт запатрабаваў ад Беларусі тлумачэння сітуацыі з Крысцінай Ціманоўскай. У арганізацыі кантактуюць з беларускай лёгкаатлеткай, яна ў бяспецы і пад абаронай японскіх улад, заявіў прадстаўнік прэс-службы МАК **Марк Адамс**, паведамляе Reuters.

У кантакце з беларускай таксама Управа Высокага камісара ААН у справах уцекачоў. Як заявіў генеральны сакратар урада Японіі **Кацунобу Като**, МАК і іншыя ўстановы размаўляюць з Ціманоўскай, каб высветліць яе намеры.

Учора, 2 жніўня, выканаўчы дырэктар Беларускага фонду спартыўнай салідарнасці **Аляксандр Апейкін** ў эфіры «Настоящего времени» паведаміў, што Ціманоўская можа папрасіць палітычнага прытулку ў Польшчы. Яна прыехала ў польскую амбасаду ў Токіо.

«Яна цяпер знаходзіцца ў Токіо. Яна ўжо мае зносіны з Міжнародным алімпійскім камітэтам і з прэсай. Падала заяву на наданне палітычнага прытулку ў Польшчы, таму яна ўжо ў дарозе знаходзіцца. З ёй усё ў парадку, – сказаў Апейкін. – Трымаецца добра, зразумела, што гэта стрэсавая сітуацыя не толькі для спартсмена, але і чалавека – апынуцца пад такім ціскам. Гэта маладая дзяўчына, на якую аказалі ціск дарослыя дасведчаныя функцыянеры».

2 жніўня сузаснавальнік спартыўнага мэдыяпарталу sports.ru **Дзмітры Навоша** ў эфіры радыё «Эхо Москвы» паведаміў, што муж Ціманоўскай пакінуў Беларусь і з'ехаў у Кіеў. Гэтую інфармацыю пацвярджае «Трыбуна».

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ



Я сказаць хачу ўсур'ёз: жонка – лепшы пыласос

У клінінгавай кампаніі мінчук заказаў уборку кватэры. Прыйшла маладзіца, сказала, што для работы ёй трэба некалькі гадзін. Гаспадар сышоў. Калі вярнуўся, дык убачыў, што ў кватэры не прыбрана, на стале шклянкі і ежа з ягонай лядоўні, а сама «прыбіральшчыца» п'яная спіць у ложку.

Вельмі хочуць кавалеры
(А яны – халасцякі),
Каб у доме ці кватэры
Быў парадак хоць які,
Каб было не сорам даму
Запрасіць туды на ноч,
Цалкам выканаць праграму,
Сексу бурнага апроч.
Дужа нудная работа –
Чысціць-мыць – для мужыка.
Як самому неахвота,
Хай жаночая рука
Пашарue ўсю падлогу
I парадак навядзе.
На падмогу, дзякуй богу,
Прыйдуць фірмы дзе-нідзе.
Безумоўна, у сталіцы
Ёсць падобныя якраз.
На паслугі маладзіцы
Халасцяк зрабіў заказ.
Прыбыла і заявіла:
– Трэба мне гадзіны тры,
І ў кватэры будзе міла,
Зазіхціць усё ўнутры.
Можаш потым дзеўку весці –
Ты ж, як бачу, лавелас...
Ля ракі ці ў парку дзесьці
Пагуляй у гэты час.
Каб праз дзве ці тры гадзіны
Быў усюды бляск і шык,
З прапановаю жанчыны
Пагадзіўся той мужык:
– Я гатовы хоць да ночы
Свой працягваць праменад!
Ды на лоб палезлі вочы,
Як вярнуўся ён назад.
Алкаголь адчуў з парога,
А ў жытле такі ж «дэкор»:
Непамытая падлога,
Непрыбраны калідор.
А на кухні – доказ п'янкі
(Зазірнуў найперш туды):
На стале – пустыя шклянкі,
Рэшткі нейкае яды.
Прыглядзеўся – млосна стала,
Не зваліўся ледзьве з ног:
То ж яго кавалак сала,
Што на вечар прыбярог!
Адчыніў лядоўню. Пуста.
Нават яек там няма.
Дзе ж сама яна, распуста,
Маладзіца-халтама?
Вунь яна – ляжыць у ложку
І мармыча:
– Лавелас,
Захацела выпіць трошку –
Сербанула твой запас.
Ну а што датычыць дзеўкі,
Замяніць яе магу...
Выглядала ўжо як здзекі,
Калі голую нагу
«Лавеласу» паказала,
Іранічна дадала:
– Вось табе ўзамен за сала...
Не хапіла проста зла,
І прагнаў яе з кватэры.
Засмуціўся дужа ён,
Бо застаўся без вячэры
І без чаркі, што на сон.
***
Бедачыне не да жартаў,
Дык і я скажу ўсур'ёз,
Што яму жаніцца варта:
Жонка – лепшы пыласос.

Рогі – гэта пыгожа

А я вам параду падкіну,
Жанкі і дзяўчаты:
Не варта даводзіць мужчыну,
Што ён не рагаты,
Бо гэта, магчыма, ні трохі
Вам не дапаможа;
А лепей давесці, што рогі –
Надзвычай прыгожа...

Выпіць хочацца

То небяспека, то пагроза,
То слёзы льюцца ад бяды...
Як на жыццё глядзець цвяроза,
Дык выпіць хочацца заўжды.

ЧУЛІ?

Інстытут імя Гётэ афіцыйна спыніў працу ў Беларусі



Гаворка пра славутую нямецкую нэўрадавую арганізацыю, якая дзейнічала ў Мінску 27 гадоў, нагадвае "Наша Ніва". Гётэ-Інстытут усяляк прасоўваў за мяжой нямецкую культуру. На яго базе працавалі курсы нямецкай мовы і ладзіліся культурныя выставы, дзякуючы гэтай установе выходзілі пераклады на беларускую мову нямецкамоўнай класікі.

157 аддзяленняў Інстытута працуюць у 98 краінах свету. Але, па словах Ёханэса Эберта, генеральнага сакратара Гётэ-Інстытута, яго ўстанова ўпершыню сутыкнулася з такім развіццём падзей.

МЫСЛИ ВСЛУХ



ОБЫКНОВЕННЫЙ ТЕРРОР

Монолог человека, попавшего в жернова репрессий белорусского режима

29 июля – ровно год назад в этот день меня арестовали. Схватили на улице в Гомеле, бросили на пол микроавтобуса. Куда-то долго везли молча. Изловчился в последний момент тиснуть сообщение в телеграм-канале, прежде чем телефон отобрали, заодно и спалив навсегда свою возможность звонка маме. Одно слово: «Орестовали». Прямо так, с ошибкой. Теперь для меня это уже не опечатка, а веха. Переломный момент.

Солженицын в романе «В круге первом» правильно описывает это состояние после ареста, которое потом не покидает и в тюрьме. Всё – рухнуло. Прежняя жизнь закончилась, возможно – навсегда. Но это только полбеды. Беда в том, что новая жизнь не начинается. И так по-настоящему и не начнется, пока ты сидишь.

Настоящая жизнь, человеческая жизнь – это уверенность в своем будущем.

Горизонт планирования может быть минимальный: сегодня вечером я лягу спать в своей кровати, а завтра утром встану и почищу зубы. И так будет завтра и послезавтра. Это иллюзия, конечно. Но ее достаточно для спокойствия, для уверенности, для счастья в конце концов. И только когда этого, самого простого, лишаешься – понимаешь, что оно не просто важно. Это база, которая позволяет тебе быть самим собой.

В тюрьме этого нет. Совсем. Вечером тебе могут не дать лечь спать. При шмоне отберут зубную щетку. В любой момент могут войти и приказать: «На выход!» А впереди – неизвестность. Куда тебя поведут в следующий раз? В баню? Или в комнату с мягкими стенами, где бьют (и не только бьют)? Или наконец-то на допрос к следователю? И когда он будет этот следующий раз – через минуту? Для некоторых – через полгода.

Слово «террор» замылилось от постоянного употребления. «А, да, террор, ну все понятно! Террор – это плохо». Теперь мы заново узнаем его невыносимую суть – чувство неизвестности, неустойчивости, неуверенности. Страх, который разрушает всё. Отсюда и стокгольмский синдром: человеку нужно хоть куда-то приземлиться, хоть какую-то прочную основу найти; и часто единственным неизменным фактором в ужасе заключения оказывается лишь его тюремщик, его мучитель. Это одно из подлейших свойств человеческой психики. И те, кто им пользуется, – ублюдки. Как говорил Шаламов, пусть и по другому поводу, «блатные – не люди».

К сожалению, для граждан что России, что Беларуси уже совсем не обязательно сидеть в тюрьме, чтобы ощутить давление террора. Каждый день новые обыски, каждый день новые аресты. На кого падет жребий завтра? В чью дверь начнут в 7 утра пинать ногами? Гуляешь с ребенком в парке, работаешь на летней веранде в кафе, смотришь вечером кино на диване – где бы ты ни был, что бы ты ни делал, полностью это чувство не покинет тебя. Как у Цоя. Живешь, строишь планы, но осознаешь, что все это может обрушиться в один момент и навсегда. И каждый твой миг отравлен этим страхом, будь ты хоть самым храбрым человеком на Земле.

Наши народы уже проходили через это без малого сто лет назад. Те, кто тогда выжил, вдохнули столько страха, что неосознанно передали его своим детям: будь незаметным и, возможно, тебя минует сия чаша. Если все молчат – молчи. Если все беснуются и рвут живьем – беснуйся и рви. Коллектив – это не друзья, не единомышленники; коллектив – это фон, под который нужно мимикрировать, чтобы избежать внимания хищников.

Новые поколения уходили от этого всё дальше. «Террор» стал пыльным словом из книг – ненадолго. Теперь он вернулся. Снова нации, измученные страхом. Травмированные на целые поколения. Одни не могут вынести давления и находят выход в самообмане. Другие отступают туда, где террор незаконен, – за пределы родной страны.

Третьи пьют чашу; многие – до дна. Мысли о них особенно печалят.

Общественное внимание тает в отсутствие событий. Самые громкие имена уходят на периферию. Где сейчас Мария Колесникова, что с ней? Навальный. Мы не слышали новостей уже очень давно. И постепенно начали забывать. Потому что отсутствие новостей для нашей психики означает – всё в порядке. Но это не так, уверяю вас. Не в порядке.

И если даже самые громкие дела стираются в памяти, хотя и года еще не прошло, что уж говорить о «новостях одного дня»? Задержали правозащитника, журналиста, вообще случайного, человека, не причастного ни к чему? Мы забываем об этом не на следующий день, а в тот же день. Потому что через два часа задерживают еще кого-то.

Но для того, кто сидит в тюрьме, любая весточка с воли, любое напоминание, что о нем помнят – это доказательство жизни. Того, что ты еще жив, что не похоронен. Как в «Памятнике» Пушкина: «ты жив, пока тебя помнят». Это правда, это в прямом смысле именно так. Да, ты не знаешь, что будет с тобой через пять минут; не знаешь, оставят ли тебе кипятильник или отнимут; ты не знаешь, будешь ли жив завтра утром; но есть человек, который помнит о тебе. И этого у тебя не отнимут.

Быть может, вам даст немного утешения тот факт, что источники террора – диктаторы, его насаждающие – тоже живут в постоянном чувстве страха. Более того, они начали чувствовать это гораздо раньше, чем подвластные им народы. Именно собственный страх они транслируют наружу, заставляя миллионы людей пройти через него вслед за ними.

Каждый миг они ждут, они знают, что в любую из ночей кто-то прокрадется в спальню. Или бомба в машине, или в водке яд. Или застучат тяжелые шаги десятков ног, распахнутся двери, войдут люди с автоматами, и в их глазах не будет раболепства, и их не обманешь и не испугаешь.

Те, кто ощущал этот страх, ужас постоянной неизвестности, знают, насколько он невыносим. Это то самое чувство, про которое говорят: «Врагу не пожелаю». Диктаторы желают его и врагам, и друзьям. И не просто желают, а распространяют, используя все возможности.

Если есть на свете настоящее зло, то оно именно здесь. Когда человек, сам испытавший страдание, боль, ужас, сознательно заставляет других, ни в чем не виноватых, испытывать то же самое.

Прошел год. Хотел бы я сказать, что стал за это время мудрее, сильнее. Нет. Появились и раздражение, и злость. Мне не нужен был этот опыт. И никому не нужен. Разве что диктаторам полезно будет побывать в тех тюрьмах, которые они построили.

Виталий ШКЛЯРОВ, политтехнолог.

СТАЛА ВЯДОМА

Беларускі Хельсінкскі камітэт атрымаў папярэджанне Мінюста

Рэспубліканскае праваабарончае грамадскае аб'яднанне «Беларускі Хельсінкскі камітэт» атрымала папярэджанне ад Міністэрства юстыцыі, паведамляецца на сайце БХК.

Валанцёры БХК назіралі за выбарамі, абаранялі адвакатаў, абаранялі правы беларусаў на пенсіі ў сувязі з пасткай стрaхавога стажу, працавалі для скасавання прымусовай працы (дэкрэты «аб дармаедах» і аб «дрэваапрацоўцы», размеркаванне), уносілі прапановы, накіраваныя на ўдасканаленне заканадаўства (напрыклад, дзякуючы БХК было замацаванае права сведкі мець адваката), выкарыстоўвалі міжнародныя праваабарончыя механізмы для абароны правоў чалавека, прасоўвалі мэты ўстойлівага развіцця і многае іншае.

6 ліпеня праваабаронцы атрымалі ад Міністэрства юстыцыі запыт на прадастаўленне інфармацыі ў сувязі з «правядзеннем кантрольных мерапрыемстваў на прадмет адпаведнасці патрабаванням заканадаўства Рэспублікі Беларусь і статута дадзенай арганізацыі».

Міністэрства хацела да 16 ліпеня атрымаць мноства дакументаў. Аднак 14 ліпеня ў офісе БХК, дзе нікога не было, прайшоўператрус. Дзверы былі ўзламаныя, а сам офіс апячатаны.

Таму БХК здолеў накіраваць у Мінюст толькі частку запытаных звестак. Праваабаронцы праінфармавалі міністэрства, што офіс быў апячатаны, і што ўсе астатнія запытаныя дакументы знаходзяцца там, у сувязі з чым не ўяўляецца магчымым прадставіць іх у названыя тэрміны – да 16 ліпеня. Было паабяцана, што астатнія дакументы будуць накіраваныя, як толькі прадстаўнікі арганізацыі будуць дапушчаныя ў апячатаны офіс.

Каб мець магчымасць трапіць у апячатаны офіс, 19 ліпеня БХК звярнуўся ў МУС, следчы камітэт і Генеральную пракуратуру краіны. Аднак да цяперашняга часу праблема не вырашана, праваабаронцы не могуць трапіць у свой офіс.

Нягледзячы на гэта, Міністэрства юстыцыі вынесла папярэджанне за непрадстаўленне дакументаў. У загадзе Мінюста таксама ўтрымліваецца патрабаванне ліквідаваць дапушчанае парушэнне да 27 ліпеня. Аднак сам загад у БХК атрымалі толькі ўвечары 27 ліпеня (пра гэта сведчыць штамп паштовага аддзялення).

"Такім чынам, у нас проста не было аб'ектыўных магчымасцей выканаць патрабаванне Міністэрства", – гавораць адказныя асобы БХК.

Беларускі Хельсінкскі Камітэт паўторна звярнуўся ў Міністэрства юстыцыі з просьбай прыняць усе магчымыя меры для забеспячэння абароны правоў і законных інтарэсаў арганізацыі, а таксама адмяніць папярэджанне з улікам таго, што непрадстаўленне дакументаў абумоўлена аб'ектыўнымі абставінамі, якія не залежаць ад арганізацыі.

"У цэлым, наша пазіцыя сёння – выкарыстоўваць усе магчымыя прававыя сродкі для захавання легальнага статусу арганізацыі. Мы спадзяёмся, што Міністэрства юстыцыі прыслухаецца да нашых аргументаў. У адваротным выпадку – будзем абскарджваць папярэджанне ў Вярхоўным судзе", – настроены ў БХК.

СТАТЫСТЫКА

Сярэдняя зарплата ва Украіне дасягнула 525 долараў. Гэта рэкорд за 30 гадоў незалежнасці



У чэрвені 2021 года рэальная заработная плата ва Украіне за 12 месяцаў вырасла на 12,9%, з мая – на 5,8%, паведамляе ўкраінскі Дзяржстат.

Сярэдняя зарплата за год павялічылася на 23,6%.

Зараз сярэдняя заработная плата штатнага работніка прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый складае 14313 грн ($525).

Самыя высокія сярэднія зарплаты ва Украіне – у Кіеве ($760). На другім месцы Данецкая вобласць ($557), на трэцім – Кіеўская ($545).

Мінімальная зарплата ва Украіне дасягае 6000 грн ($223).

Сярэдняя зарплата ва Украіне (супастаўная з беларускай) з'яўляецца адной з самых нізкіх у Еўропе. Ад суседняй Польшчы Беларусь і Украіна адстаюць амаль у тры разы.

(NN.by)

СЛЫШАЛИ?

На 90-м году жизни умер последний член ГКЧП Бакланов


© Andrew/Sputnik/dpa/picture alliance

Скончался глава ракетно-космической отрасли СССР и член Государственного комитета по чрезвычайному положению (ГКЧП) Олег Бакланов, сообщил в Telegram-канале руководитель «Роскосмоса» Дмитрий Рогозин.

«Ушел из жизни Олег Дмитриевич Бакланов, руководивший нашей ракетно-космической отраслью и возглавлявший Министерство общего машиностроения СССР. Олег Дмитриевич дружил с моим отцом, часто бывал в нашем доме», – написал Рогозин.

Олег Бакланов родился 17 марта 1932 года в Харькове. Работать он начал с должности монтажника на Харьковском приборостроительном заводе. На этом предприятии он дослужился до поста директора. В 1976 году стал заместителем министра общего машиностроения, а в 1983 году он возглавил это ведомство.

С 1985-го по 1988 год Бакланов руководил программой создания сверхтяжелой ракеты «Энергия» и космического челнока «Буран». Являлся членом ЦК КПСС, носил звание Героя Социалистического Труда.

В августе 1991 года Бакланов вошел в ГКЧП. После путча его арестовали и обвинили в попытке захвата власти. В феврале 1994 года Бакланова амнистировали. С 2004-го по 2007 год он занимал пост советника вице-спикера Госдумы Сергея Бабурина. После смерти Дмитрия Язова в конце февраля 2020 года он оставался последним членом ГКЧП.

STOP!

Фуры, везущие грузы из Литвы в Беларусь, оснастят навигационными пломбами

В постановлении сделано исключение для грузовиков, перевозящих товары из Калининградской области в Беларусь по территории Литвы в рамках процедуры таможенного транзита.

Фуры, перевозящие международные грузы из Литвы в Беларусь, должны будут обязательно использовать навигационные пломбы, начиная с 30 августа.

Решение закреплено постановлением Совмина, официальный документ опубликован в пятницу на Национальном правовом интернет-портале.

В постановлении сделано исключение для грузовиков, которые перевозят товары из Калининградской области в Беларусь по территории Литвы в рамках таможенного транзита. Также навигационные пломбы можно не использовать тяжеловесным или крупногабаритным транспортным средствам, для проезда которых нужно получать специальное разрешение.

Постановление вступает в силу через 30 дней после официального опубликования.

Зачем нужны навигационные пломбы?

Навигационная пломба – это устройство, с помощью которого можно отслеживать передвижение грузов по территории ЕАЭС. Она устанавливается на границе, а снимается таможней в конечном пункте следования грузовика.

На территории Беларуси устройства устанавливаются в 12 автомобильных пунктах таможенного оформления. По три таких пункта находятся на границах с Украиной и Польшей, два – с Латвией и четыре – с Литвой.

Запускается навигационное устройство с помощью специального мобильного приложения.

Белорусские таможенники используют электронную навигационную пломбу, которая состоит из электронного блока многоразового применения и элемента пломбирования. В отдельных случаях при перевозках по территории республики, совместно с навигационной пломбой применяют специальное крепежное приспособление. Его разработал национальный оператор Беларуси в соответствии с требованиями таможенников.

Как ранее рассказывали Sputnik в ГТК, навигационные пломбы применяются при выявлении признаков несоблюдения законодательства, а также при неоднократном нарушении перевозчиком правил транзита товаров.

Также они позволяют сокращать количество мер таможенного контроля в пунктах пропуска за счет направления товаров под такой пломбой для контроля внутрь страны.

Тем не менее, пломба не приобретается перевозчиком в собственность. Это услуга, которую оказывает национальный оператор перевозчику. Тариф составляет пять базовых величин (на сегодня это 29 белорусских рублей – Sputnik), включая налог на добавленную стоимость.

СЛЫШАЛИ?

В Китае репетиторство приравняли к проституции и азартным играм



Власти городов Сяньян и Хуанган в центральной китайской провинции Хубэй поручили правоохранительным органам, ответственным за борьбу с порнографией и незаконными публикациями, пресекать нелегальное репетиторство.

